«Асколкам абарванае жыццё» (1978), твораў пра баявую службу пагранічнікаў і інш. У 1960 Бабруйскі вандроўны тэатр паставіў п'есу А. «Сястра Варвара».

*Тв.:* Испытание.— Мн., 1968.

**АЛЯКСЕЕЎ** Яўген Кузьміч (2.2.1884, г. п. Вісіма-Уткінск Свярдлоўскай вобл. — 21.1.1972), бел. сав. аграном-раслінавод. Акад. АН БССР (1940), Акадэміі с.-г. навук БССР (1957—61), д-р с.-г. н. (1936), праф. (1951). Чл. КПСС з 1958. Скончыў Казанскі настаўніцкі ін-т (1903), Вышэйшыя с.-г. курсы ў Пецярбургу (1911). З 1916 дырэктар Навазыбкаўскай с.-г. доследнай станцыі. У 1928—30 прафесар, заг. кафедры БСГА, з 1937 прафесар, заг. кафедры Маск. заатэхн. ін-та, у 1955—59 прафесар, заг. кафедры земляробства, глебазнаўства і аграхіміі Усесаюзнага с.-г. ін-та завочнай адукацыі. Адначасова ў 1946—59 заг. аддзела лубіну і сідэрацыі Бел. НДІ земляробства. Распрацаваў агратэхніку зялёных угнаенняў (сідэратаў). Вывучыў умовы, якія вызначаюць эфектыўнасць зялёнага ўгнаення на розных глебах, у розных кліматычных зонах. Чл. ЦВК БССР у 1929—30.

*Тв.:* Зернобобовые культуры в БССР.— Мн., 1953; Зелёное удобрение на орошаемых землях.— М., 1957; Зелёное удобрение в нечернозёмной полосе.— М., 1959; Зелёное удобрение.— Мн., 1970 (разам з В. С. Рубанавым, К. І. Доўбанам).

**АЛЯКСЕЙ МІХАЙЛАВІЧ** (19.3.1629—29.1.1676), рускі цар [1645—76]. Прыхільнік абсалютызму. Урад А. М. стымуляваў развіццё прам-сці і гандлю, рэарганізаваў армію. Задушыў нар. паўстанні ў Маскве (1648, 1662), Пскове і Ноўгарадзе (1650), сял. вайну пад кіраўніцтвам С. Разіна (1670—71) і інш. Пры ім Саборнае улажэнне 1649 канчаткова афарміла прыгоннае права. Вёў актыўную знешнюю палітыку. У 1654 пачаў вайну з Рэччу Паспалітай за Украіну і Беларусь (гл. *Руска-польская вайна 1654—67*, т. 1), у выніку якой замацавана ўз'яднанне Левабярэжнай Украіны з Расіяй, Расіі вернуты Смаленск, Северская і інш. землі. Асабіста удзельнічаў у ваен. паходах, быў у Смаленску (1654), Вільні, Гродне (1655), Рызе, Віцебску, Магілёве, Полацку (1656). Да свайго тытула дадаў «вял. кн. Літоўскі і Белай Расіі, Валынскі і Падольскі». У вайне са Швецыяй (1656—58) за выхад да Балтыйскага мора не дасягнуў мэты.

**АЛЯХНОВІЧ** Антон Адамавіч (2.4.1914, в. Дабраводка Смалявіцкага р-на — 29.12.1979), Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Айч. вайну з вер. 1942 у авіяцыі далёкага дзеяння. Удзельнік баёў пад Сталінградам, Курскам, Ленінградам, вызвалення Беларусі, Украіны, Прыбалтыкі, Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі. Нам. камандзіра авіяпалка далёкага дзеяння маёр А. зрабіў 260 баявых вылетаў, 25 палётаў па дастаўцы грузаў бел. партызанам. Да 1958 у Сав. Арміі. палкоўнік.

**АЛЯХНОВІЧ** Мсціслаў Антонавіч (н. 22.2.1905, Гродна), польскі лінгвіст. Д-р філал. (1963) і пед. (1966) навук. Скончыў Віленскі ун-т (1938). З 1949 выкладчык рус. мовы, з



Я. К. Аляксееў.



А. А. Аляхновіч.

1966 заг. кафедры рус. філалогіі Лодзінскага ун-та. Займаецца вывучэннем бел. мовы і фальклору. Аўтар прац «Польскія запазычанні беларускай моваю (Ад паловы 16 ст. да 1863 г.)» (1964), «Даследчыкі палескага фальклору ў першай палове 19 ст.» (1965), «Беларускія элементы ў польскай песні першай паловы 19 ст.» (1966), прадмовы да выд. кн. А. Кольберга «Беларусь — Палессе» (1968) і інш.

**АЛЯХНОВІЧ** Яўген Антонавіч (20.5.1920, г. Зугрэс Данецкай вобл. — 30.1.1945), Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. Беларус. У Айч. вайну з 1942 на Варонежскім, Сцяпным, 2-м і 1-м Укр. франтах. Нам. камандзіра — штурман эскадрыллі штурмавога авіяпалка, ст. лейтэнант, зрабіў 165 баявых вылетаў на штурмоўку жывой сілы, тэхнікі і абаронных умацаванняў праціўніка. Загінуў у баі. У Зугрэсе яго імем названа вуліца, пастаўлены помнік.

**АЛЯШКЕВІЧ** Васіль Антонавіч (28.1.1893, в. Еськавічы Нясвіжскага р-на — 18.7.1972), адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Грамадз. вайну. Чл. КПСС з 1917. З 1915 у арміі, вёў бальшавіцкую прапаганду. Пасля Лют. рэвалюцыі чл. палкавога к-та. У час акупацыі Беларусі ням. войскамі арганізатар і камісар партыз. атрада Лапскай вол. Слуцкага пав. (з мая 1918). У час польск. інтэрвенцыі камісар аб'яднанага партыз. атрада Случчыны (з мая 1919), з жн. 1919 на падп. рабоце ў Бабруйскім пав., арганізатар партыз. атрада імя III Інтэрнацыянала. У 1920—21 ваен. камісар Парыцкай вол. Бабруйскага пав., удзельнік барацьбы з бандамі Булак-Балаховіча. У 1922—49 на сав. і гасп. рабоце.

**АЛЯШКЕВІЧ** Іван Баніфатавіч (26.11.1900, в. Ізабеліна Кіраўскага р-на — 2.7.1977), бел. сав. хірург. Д-р мед. н. (1949), праф. (1949). Засл. дз. нав. БССР (1969). Засл. урач БССР (1959). Чл. КПСС з 1953. Скончыў Кіеўскі мед. ін-т (1926). Удзельнік Айч. вайны. З 1949 заг. кафедры шпітальнай хірургіі Віцебскага мед. ін-та, у 1965—77 кафедры хірургіі і анестэзіялогіі Бел. ін-та удасканалення урачоў. Працы па хірург. лячэнне



Я. А. Аляхновіч.



І. І. Аляшкевіч. Аўтапартрэт.

хвароб страўнікава-кішачнага тракту і жоўцевага пузыра, пра траўматычны шок, анаэробную інфекцыю.

**АЛЯШКЕВІЧ** Іосіф Іванавіч (1777, мяст. Шылува, Расейнскі р-н Літ. ССР — 1830), жывапісец. Творчасць звязана з маст. жыццём Беларусі і Расіі. Скончыў Віленскую маст. школу (1803), працаваў у майстэрнях франц. мастакоў Ж. А. Д. Энгра і Ж. Л. Давіда. З 1811 жыў у Пецярбургу. Часта выязджаў у бел. губерні, дзе стварыў шмат цікавых партрэтаў у стылі позняга класіцызму і рамантызму. Сярод іх «Групавы партрэт», «Партрэт дзяўчынкі», партрэты Л. Сапегі, М. Радзівіла, А. Чартарыйскага, Г. Ржавускага, Плятэра і інш. Напісаў партрэт А. Міцкевіча (1828).

**АЛЯШКЕВІЧ** Сцяпан Філімонавіч (1910, в. Неравоз Бярэзінскага р-на — 1.5.1944), Герой Сав. Саюза (1944). Канд. у чл. КПСС. У Айч. вайну на фронце з сак. 1943, разведчык. Удзельнік баёў пад г. Корсунь-Шаўчэнкаўскім, Уманню. Вызначыўся пры фарсіраванні Паўд. Буга вясной 1944: з групай разведчыкаў пераправіўся праз раку і вёў бой супраць намнога большых сіл праціўніка за расшырэнне плацдарма, садзейнічаў паспяховай пераправе палка. Загінуў пры ўзрыве моста ў тыле ворага на р. Малдова (Румынія). Пахаваны на ст. Вама. У в. Чыжаха Бярэзінскага р-на А. ўстаноўлены помнік.



С. Ф. Аляшкевіч.



А. Л. Амбросаў.

**АМБРАЖУНАС** Пётр Іосіфавіч (24.1.1892, в. Грумшлі Біржайскага р-на Літ. ССР — 20.12.1937), дзярж. дзеяч БССР. Чл. КПСС з 1919. Удзельнік 1-й сусв. вайны, Лют. і Кастр. рэвалюцый 1917, Грамадз. вайны ў Літве і на Беларусі. Старшыня Аршанскага (1924—28) і Гомельскага (1928—30) акрвыканкомаў, нам. старшыні ВСНГ БССР, нарком камунальнай гаспадаркі БССР (1934—36), старшыня праўлення Саюза архітэктараў БССР (1934—37). Канд. у чл. ЦК у 1927—30 і чл. ЦК КП(б)Б у 1930—37. Чл. ЦВК у 1924—37 і канд. у чл. Прэзідыума ЦВК БССР у 1929—31, 1935—37.

**АМБРОСАЎ** Антон Лаўрэнцьевіч (н. 16.6.1912, в. Дрыколле Віцебскага р-на), бел. сав. фітапатолаг-вірусолаг. Чл.-кар. АН БССР (1970), д-р біял. н. (1967), праф. (1977). Чл. КПСС з 1945. Скончыў Ленінградскі с.-г. ін-т (1936). З 1944 дырэктар Ганусаўскай с.-г. доследнай станцыі, з 1951 ва ўпраўленнях сельскай гаспадаркі Баранавіцкага і Маладзечанскага аблвыканкомаў, з 1955 у Мін-ве сельскай гаспадаркі БССР, з 1956 заг. аддзела Бел. НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва, З 1971 дырэктар, з 1978 заг. лабараторыі вірусалогіі Бел. НДІ аховы раслін. Асн. працы па пытаннях павышэння ўстойлівасці бульбы да вірусных хвароб. Выявіў відавы састаў вірусаў, шкодных для бульбы, вывучыў іх біял. асаблівасці. Распрацаваў і прапанаваў для вытв-сці сістэму мерапрыемстваў па аздараўленню насеннага матэрыялу бульбы. Дзярж. прэмія СССР 1971 за вывядзенне, пашырэнне і ўкараненне высокапрадукцыйных сартоў бульбы.

*Тв.:* Вирусные болезни картофеля и методы выращивания здоровых клубней.— Мн., 1964; Вирусные болезни картофеля и меры борьбы с ними.— Мн., 1975; Физиология картофеля.— М., 1979 (у сааўт.).

**АМБРОСЕНКА** Аляксей Пятровіч (н. 1.5.1925, в. Марчанкі Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл.), Герой Сац. Працы (1961). Чл. КПСС з 1959. З 1957 кранавадзіцель буд.-мантажнага цягніка на ст. Актагай Семіпалацінскай вобл., у 1961—68 машыніст пуцеўкладчыка буд.-мантажнага цягніка ў Макацкім р-не Гур'еўскай вобл. З 1977 аўтамеханік у калгасе імя Кутузава Гарадоцкага р-на. Званне Героя прысвоена за прац. поспехі на буд-ве чыг. лініі Актагай — Дружба.

**АМЕЛЬЯНОВІЧ** Уладзімір Аляксандравіч (н. 1.7.1924, в. Палкасоўе Навагрудскага р-на), поўны кавалер ордэна Славы, засл. работнік сельскай гаспадаркі БССР (1975). У Айч. вайну на фронце з 1944. Разведчык сапёрнага батальёна, яфрэйтар. Вызначыўся ў баях ва Усх. Прусіі: 28.12.1944 з групай разгароды пад агнём ворага зрабіў 3 праходы ў мінных палях; на надыходзе да Кёнігсберга ўдзельнічаў у разведцы абароны праціўніка; 30.3.1945 у драцяной загародзе ворага зрабіў праход для разведкі; 2—5.5.1945 размініраваў мінныя палі каля пярэдняга краю сав. абароны. Вызначыўся таксама пры разгроме Квантунскай арміі Японіі на Д. Усходзе.